УДК 94(476-22)«1921/1939»

# ЭТАПЫ САВЕЦКАЙ МАДЭРНІЗАЦЫІ І САЦЫЯКУЛЬТУРНЫЯ ЗМЕНЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ ВЁСЦЫ (1921–1939)

*С. М. ХОДЗІН*[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

Даследуюцца этапы, асаблівасці і мадэлі мадэрнізацыі, якая адбывалася ў Беларусі ў 1920–30-я гг. Праводзіцца кампаратыўнае вывучэнне розных этапаў беларускай гісторыі не толькі з улікам нацыянальнай спецыфікі, але і ў кантэксце агульнарасійскіх і агульнаеўрапейскіх працэсаў. Ажыццяўляюцца пошукі новай парадыгмы гісторыі Беларусі на аснове міждысцыплінарнага падыходу ва ўмовах пераадолення манаполіі марксісцка-ленінскай метадалогіі. Прасочваюцца змены ў зямельным заканадаўстве, якое адлюстроўвала асаблівасці нацыянальнай мадэлі мадэрнізацыі ў 1924–1928 гг. Паказана, што мадэрнізацыя ў Беларусі базіравалася на фактарах працавітасці сялян і ашчаднасці пры апоры на мясцовыя рэсурсы (вытворчасць інтэнсіўных культур, прадукцыі жывёлагадоўлі, забеспячэнне іх перапрацоўкі і лагістыкі). Зроблена выснова пра тое, што на мяжы 1920–30-х гг. адбываліся значныя змены не толькі ў формах мадэрнізацыі, але і ў сацыяльнай псіхалогіі і эканамічных паводзінах сялянства, перш за ўсё ў стаўленні да зямлі, працы і адукацыі. Адзначана, што ва ўмовах, калі калектыўныя гаспадаркі разглядаліся як сродак канфіскацыі збожжавай прадукцыі, перавагі асабістай матывацыі пры высокай працавітасці сялян выявіліся ў падсобнай гаспадарцы, якая ў самых розных формах паступова інтэгравалася з грамадскай вытворчасцю.

***Ключавыя словы:*** мадэрнізацыя; нацыянальная і ўнітарысцкая мадэлі мадэрнізацыі; беларуская вёска; сацыякультурныя змены; беларускае заканадаўства 1920-х гг.

# ЭТАПЫ СОВЕТСКОЙ МОДЕРНИЗАЦИИ И СОЦИОКУЛЬТУРНЫЕ ИЗМЕНЕНИЯ В БЕЛОРУССКОЙ ДЕРЕВНЕ (1921–1939)

*С. Н. ХОДИН*[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Республика Беларусь*

Исследуются этапы, особенности и модели модернизации, происходившей в Беларуси на протяжении 1920–30-х гг. Проводится компаративное изучение различных этапов белорусской истории не только с учетом национальной специфики, но и в контексте общероссийских и общеевропейских модернизационных процессов. Осуществляются поиски новой парадигмы истории Беларуси на основе междисциплинарного подхода в условиях преодоления монополии марксистско-ленинской методологии. Прослеживается изменение земельного законодательства, которое отражало особенности национальной модели модернизации в 1924–1928 гг. Показано, что модернизация в Беларуси базировалась на факторе трудолюбия крестьян и бережливости при опоре на местные ресурсы (производство интенсивных культур, продукции животноводства и обеспечение их переработки и логистики). Сделан вывод о том, что на рубеже 1920–30-х гг. происходили значительные изменения не только в формах модернизации, но и в социальной психологии и экономическом поведении крестьянства, прежде всего в отношении к земле, труду и образованию. Отмечено, что в условиях, когда коллективные хозяйства рассматривались как средство изъятия зерновой продукции, преимущества личной мотивации при высоком трудолюбии крестьянства выявились в подсобном хозяйстве, которое в самых различных формах постепенно интегрировалось с общественным производством.

***Ключевые слова:*** модернизация; национальная и унитаристская модели модернизации; белорусская деревня; социокультурные изменения; белорусское законодательство 1920-х гг.

**Образец цитирования:**
Ходзін С. М. Этапы савецкай мадэрнізацыі і сацыякультурныя змены ў беларускай вёсцы (1921–1939) // Весн. БДУ. Сер. 3, Гісторыя. Эканоміка. Права. 2016. № 3. С. 32–39.

**For citation:**
Khodzin S. M. The stages of the Soviet modernization and socio-cultural changes in the Belarusian village (1921–1939). *Vesnik BDU. Ser. 3, Gistoryja. Jekanomika. Prava.* 2016. No. 3. P. 32–39 (in Belarus.).

**Автор:**
***Сергей Николаевич Ходин*** – кандидат исторических наук, доцент; проректор по учебной работе.

**Author:**
***Siarhei Khodzin***, PhD (history), docent; vice-principal for academic affairs.
*skhodzin@mail.ru*

# THE STAGES OF THE SOVIET MODERNIZATION AND SOCIO-CULTURAL CHANGES IN THE BELARUSIAN VILLAGE (1921–1939)

***S. M. KHODZIN*** [a]

[a]*Belarusian State University, Nezavisimosti avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus*

The dynamics, ways and a model of modernization in Belarus in the 1920–30s come under review in the article. Significant comparative study of the different stages in Belarusian history not only in the tradition of development, but also in the context of Russian and European modernization processes. In the conditions of overcoming the monopoly of Marxist-Leninist methodology based on an interdisciplinary approach defines the search for new paradigms vision of the historical past of Belarus. Particularly evident the change in land legislation, it reflects the implementation of the national model of modernization of Belarus in 1924–1928, which was based on the factor of diligence and thrift peasants by relying on the internal resources of Belarus on the basis of production of intensive crops, livestock products and their processing and logistics. It is concluded, at the turn of 1920–1930s, there were significant changes not only in the forms of modernization, but also in social psychology and economic behavior of the peasantry, particularly in relation to land, labor, and education. The unitary model of modernization in Belarus was implemented by new generations of Belarusians, who grew up under the Soviet regime and sought to radically transform society. In the conditions when the collective farms were seen as a means of seizure of grain products, benefits of self-motivation with a high diligence of the peasantry was revealed in a personal part-time farm, which is a significant period played a crucial role in the production of meat, milk and potatoes, and in various forms is gradually integrated with social production.

***Key words:*** modernization; a national and unitary model of modernization; the Belarusian village; socio-cultural changes; the Belarusian legislation in the 1920s.

Міжваенны час у гісторыі Беларусі ўключае два перыяды: 1921–1928 і 1929–1939 гг., якія найчасцей супрацьпастаўляюцца адзін аднаму. Па меркаванні М. П. Касцюка, «новая эканамічная палітыка з'явілася эфектыўным сродкам мадэрнізацыі эканамічных, сацыяльных і грамадска-палітычных адносін у Беларускай ССР, як і ва ўсёй савецкай дзяржаве» [1, с. 205]. Неабходнасць мадэрнізацыі (як асучаснівання) абумоўліваецца нераўнамернасцю развіцця розных краін, а таму заканамерным працэсам з'яўляецца «даганяючае развіццё». Аднак ці прадугледжвае гэта наяўнасць аднаго дакладна вызначанага ўзору, пэўнага эталона змен? Беларусь у складзе Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ) істотна абганяла ў развіцці тэрыторыю, на якой пасля сфарміраваліся ЗША. У гэтым выпадку назіраецца, паводле трапнага выразу С. П. Капіцы, пэўная «турбулентнасць часу». Прывядзём яшчэ адзін прыклад: рэальны сацыялізм, здавалася б, даўно пахаваны грамадствам спажывання, але ў краінах Захаду сёння праяўляюцца тэндэнцыі фундаментальнага крызісу неалібералізму, пра што сведчыць уваходжанне дэмакратычнага сацыяліста Б. Сандэрса (канкурэнта Х. Клінтан) у склад Дэмакратычнай партыі ЗША і прызначэнне новым кіраўніком Лейбарысцкай партыі сацыяліста Дж. Корбіна – стваральніка камісіі па выпрацоўцы новай эканамічнай палітыкі. У шэрагу краін мадэрнізацыя рэалізуецца на аснове сінтэзу традыцыйнага і сучаснага. У прэамбуле Канстытуцыі Кітайскай Народнай Рэспублікі ў якасці карэннай задачы дзяржавы называецца сацыялістычная мадэрнізацыя [2].

На пачатку 1920-х гг. тэарэтыкамі бальшавіцкай партыі праводзілася вымушаная адаптацыя палажэнняў марксізму да абставін, якія склаліся ў БССР, дзе пражывала пераважна сялянскае насельніцтва. Ва ўмовах станаўлення інстытутаў дзяржаўнай улады ў Беларусі (ЦВК, СНК БССР) гэта стала адной з найважнейшых прычын фарміравання нацыянальнай палітыкі мадэрнізацыі. Сялянства атрымала магчымасць адукацыі на роднай мове, выбару форм гаспадарання на зямлі, уключылася ў працэс вылучэння кіраўнічай эліты. На працягу 1921–1924 гг. складваліся і іншыя перадумовы для мадэрнізацыі: адмена надзвычайнага становішча, узбуйненне тэрыторыі БССР, адкрыццё ўніверсітэта, сельскагаспадарчых навукова-даследчых і адукацыйных устаноў. Фарміраванне мясцовых органаў кіравання шмат у чым абапіралася на традыцыі сялянскай грамады. Удасканальваліся нацыянальная палітыка (беларусізацыя, каранізацыя), сістэма заканадаўства.

Асабліва заўважнымі былі нованаўвядзенні ў галіне зямельнай палітыкі і зямельнага заканадаўства. Асноўныя іх палажэнні абапіраліся на агульныя традыцыі адмовы ад прыватнай уласнасці на зямлю. Яшчэ да першага ўзбуйнення тэрыторыі рэспублікі быў распрацаваны Зямельны кодэкс БССР 1923 г., які істотна адрозніваўся ад Зямельнага кодэкса РСФСР, зацверджанага 1 снежня 1922 г., у першую чаргу ў пытаннях абшчынных адносін [3]. Новы Зямельны кодэкс БССР, які распаўсюджваў свой уплыў на ўсю тэрыторыю Савецкай Беларусі, быў зацверджаны 21 лютага 1925 г. [4]. Галоўнае яго адрозненне ад папярэдняга кодэкса заключалася ў адмаўленні ад абшчыннай формы землекарыстання, акрамя таго, у ім не дапускаліся ўраўняльныя перадзелы. Гэтыя змены ў заканадаўстве былі абумоўлены

імкненнем падтрымаць зацікаўленасць сялянства ў паляпшэнні ўмоў гаспадарання. З мэтай абмежаваць ураўняльныя тэндэнцыі, якія пераважалі ў некаторых усходніх акругах БССР, было вызначана, што ўстанаўленне нормы надзялення зямлёй застаецца ў кампетэнцыі Наркамата земляробства БССР. На тэрыторыі Расіі абмежаванне перадзелаў зямлі Зямельным кодэксам РСФСР 1922 г. сялянства сустрэла з выразным незадавальненнем. Ідучы насустрач патрабаванням насельніцтва, у канцы 1927 г. Урад РСФСР дазволіў ажыццявіць агульны ўраўняльны перадзел зямлі ў тых зямельных таварыствах, у якіх яго не праводзілі з 1922 г. і дзе захавалася значная нераўнамернасць у землекарыстанні двароў. Як адзначала Л. В. Аліева, «у гэтых выпадках агульны перадзел земель мог адбывацца нават па патрабаванні меншасці членаў таварыства»[1] [5, с. 150]. Зямельны кодэкс РСФСР 1922 г. утрымліваў асобны раздзел, які рэгламентаваў абшчынны парадак землекарыстання і перадзелы зямлі.

Супастаўленне зямельных кодэксаў БССР 1923 і 1925 гг. дазваляе выявіць пэўныя тэндэнцыі ў развіцці заканатворчага працэсу, які адбываўся на працягу трох гадоў. Згодна з пастановай Цэнтральнага выканаўчага камітэта Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў БССР (ЦВК БССР) «Аб увядзенні ў дзеянне Зямельнага кодэкса», прынятай на II сесіі 29 сакавіка 1923 г., урэгуляванне размеркавання зямель запаснога фонду (найперш памешчыцкіх і царкоўных), дзе яно не было завершана, а таксама абрэзка паўпрацоўных гаспадарак працягваліся ў ранейшым парадку да яго завяршэння (п. 3 арт. 55). Маючы на ўвазе канфлікты з сялянствам, працу па пошуку дадатковых зямельных плошчаў, II сесія ЦВК БССР даручыла Наркамату земляробства (НКЗ) распрацаваць Лясны кодэкс БССР (п. 8). Згодна з п. 1 Зямельнага кодэкса БССР 1923 г. права прыватнай уласнасці на зямлю, нетры, ваду і лясы адмянялася. У асноўных палажэннях кодэкс дазваляў выкарыстоўваць у якасці нарматыўных дакументаў уставы (прыгаворы) зямельнай грамады і мясцовых звычаяў, калі іх прымяненне не супярэчыла закону [3]. Узбуйненне БССР у 1924 г. вымусіла ўнесці карэктывы ў заканадаўства. Адпаведны пункт Зямельнага кодэкса БССР 1925 г. захоўваў для зямельных таварыстваў права карыстацца сваімі ўставамі (прыгаворамі), выключыўшы дзеянне мясцовых традыцый [4].

Абвяшчэнне зямлі ўласнасцю дзяржавы працоўных выклікала неабходнасць дэкляраваць кожнаму грамадзяніну права набыць надзел. Ва ўмовах малазямелля рэалізацыя такой магчымасці ўяўлялася даволі спрэчнай. Для забеспячэння магчымасці надзялення зямлёй усіх ахвотных займацца сельскай гаспадаркай Зямельны кодэкс БССР 1925 г. прадугледжваў пэўную чаргу: найперш зямля давалася калектывам і карэннаму працоўнаму насельніцтву, потым «прышлым» [4]. Яшчэ адной адметнасцю кодэкса было яго ўвядзенне ў дзеянне 21 лютага 1925 г. на чатырох дзяржаўных мовах БССР.

Захоўваліся традыцыі і ў яшчэ адным істотным аспекце. Калі зямля доўгі час не апрацоўвалася (напрыклад, пры доўгай адсутнасці карыстальніка на месцы), то карыстальнік (як раней уладальнік) губляў свае правы на яе і надзяляўся зямлёй пры вяртанні ўжо на іншых умовах і ў іншым месцы (гэта правіла мела месца ў п. 16 Зямельнага кодэкса БССР і 1923, і 1925 гг.). Права на зямлю, паводле кодэкса 1925 г., магло рэалізоўвацца ў форме надзялення зямельным участкам у адным ці некалькіх месцах альбо як права на ўдзел у сумесным карыстанні ўгоддзямі зямельнага таварыства. Аднак у новай рэдакцыі кодэкса знік пералік форм землекарыстання (хутар, водруб і г. д.) [4].

Рэалізуючы працоўны прынцып землекарыстання, беларускія кодэксы абмяжоўвалі пэўнымі ўмовамі і тэрмінамі магчымасць здаваць зямлю ў арэнду. Да таго ж, у адрозненне ад Зямельнага кодэкса РСФСР 1922 г. (з папраўкамі ад 1926 г.), кодэксы БССР дапускалі толькі працоўную арэнду, прычым арандатар меў права атрымаць колькасць зямлі не большую, чым мог апрацаваць сіламі свайго двара (п. 30 кодэксаў 1923 і 1925 гг.). Гэтаксама раздзел III кодэксаў дапускаў выкарыстанне наёмнай працы толькі пры ўмове, калі «ўсе наяўныя працаздольныя члены гаспадаркі разам з наёмнымі рабочымі прымаюць удзел у працы гаспадаркі» (п. 39). Сацыяльныя ўзаемаадносіны ў вёсцы рэгуляваліся раздзелам IV «Аб зямельным таварыстве (таварыстве землекарыстальнікаў)».

Адзінкай гаспадарання выступаў двор – сямейна-працоўнае аб'яднанне асоб, якія вядуць сумесную гаспадарку, таму колькасць членаў двара магла ўключаць як адну асобу, так і некалькі сем'яў. Пры гэтым для падзелу зямлі, што знаходзілася ў карыстанні двара, павінна была існаваць магчымасць стварэння новых працоўных гаспадарак. Падзел маёмасці не заўсёды вызначаў межы зямельных надзелаў. Аднак калі шляхам падзелу ствараўся новы двор, то ён мог патрабаваць таксама выдзялення ўчастка для пабудовы жылых і гаспадарчых будынкаў. Пацвярджаючы звычаёвае права, Зямельны кодэкс БССР патрабаваў, каб у выпадках падзелу гарантаваліся аднолькавыя правы для мужчын і жанчын. Пры гэтым і Зямельны кодэкс БССР 1923 г., і Зямельны кодэкс БССР 1925 г. утрымлівалі нормы, якія былі накіраваны супраць драблення гаспадарак (двароў).

Не ўносіліся змены і ў раздзел VI «Аб парадку працоўнага землекарыстання». Так, п. 88 кодэкса 1923 г. і п. 86 кодэкса 1925 г. дапускалі ўчастковы (цераспалосіца, адрубны ці хутарскі ўчасткі)

[1] Тут і далей пераклад наш. – *С. Х.*

і таварыскі (сельскагаспадарчая камуна, арцель ці таварыства па сумеснай апрацоўцы зямлі) тыпы землекарыстання. Пры адрубным землекарыстанні ўвесь надзел землекарыстальніка ці аднародныя ўгоддзі (напрыклад, ворыва) размяшчаліся ў адным месцы пры захаванні двара ў агульным пасяленні. Пры хутарскім землекарыстанні дваровае месца землекарыстальніка знаходзілася ў складзе ўчастка, зведзенага да аднаго месца з асноўных угоддзяў. Такім чынам, хутаранін не мог прэтэндаваць на выдзел зямлі з угоддзяў агульнага карыстання зямельнага таварыства.

Кодэкс 1925 г. больш дакладна акрэсліваў рэгуляванне максімальных і мінімальных норм землекарыстання, уводзячы правіла, згодна з якім абследаванне і абрэзка гаспадарак, што перавышалі сваім памерам устаноўленыя нормы, маглі адбывацца па-за межамі землеўпарадкавання (п. 96). За НКЗ згодна з кодэксам 1925 г. заставалася і выпрацоўка ўмоў прызнання гаспадарак культурнымі. Акрамя ўмоў таварыскага землекарыстання, кодэксы рэгулявалі пытанні грамадскай апрацоўкі зямлі.

Кодэксы 1923 і 1925 гг. дэталёва вызначалі пытанні землеўпарадкавання: уся праца ў гэтым кірунку павінна была праводзіцца пад кантролем НКЗ мясцовымі землеўпарадкавальнымі ўстановамі праз упаўнаважаных на тое землямераў-землеўпарадчыкаў. Асобныя правілы вызначалі аплату за землеўпарадкавальныя работы, аднак гэта не заўсёды з'яўлялася прычынай адсутнасці землеўпарадкавання. Акрамя аплаты, удзельнікі землеўпарадкавання былі абавязаны на час правядзення работ забяспечыць упаўнаважаных асоб жыллём з ацяпленнем, асвятленнем і абсталяваннем, матэрыяламі для працы, падводамі для пераездаў і перавозкі інструментаў, а таксама неабходнай рабочай сілай (п. 160). Маючы на ўвазе ўчасткова-падворны парадак землекарыстання, зямельныя кодэксы БССР дазвалялі зямельным таварыствам самім ажыццяўляць размеркаванне зямлі ў залежнасці ад колькасці едакоў, працоўнай сілы, але нормы вызначаліся толькі НКЗ.

Да 1917 г. у карыстанні сялянства Беларусі знаходзілася 6816 тыс. га зямлі (54,3 %), у прыватным карыстанні буйных землеўладальнікаў – 4836 тыс. га (38,2 %), іншыя землі складалі 903 тыс. га (7,2 %). У 1925 г. у працоўным землекарыстанні знаходзілася 8178 тыс. га (65,2 %), дзяржаўны лясны фонд склаў 5263 тыс. га (25 %), лясы мясцовага значэння займалі 492 тыс. га (3,9 %), у дзяржаўнай зямельнай маёмасці было 400 тыс. га (3,2 %), гарадскія землі і землі іншага спецыяльнага прызначэння складалі 222 тыс. га (1,79 %) [6, арк. 312]. Згодна з рашэннем IV сесіі ЦВК БССР першага склікання ў студзені 1925 г. быў створаны запасны фонд. Ён складаўся з участкаў, пералічаных у зямельны фонд з ляснога (279 450 га); з дзяржаўнай маёмасці (53 700 га); часткі непрыдатных зямель, якія не выкарыстоўваліся належным чынам (75 350 га); з абрэзак зямлі ў гаспадарках, якія перавышалі вызначаныя максімальныя нормы землезабеспячэння (да 500 га) [6, арк. 313]. У 1925 г. запасны фонд складаў 718 500 га, але з іх 109,5 тыс. га з'яўляліся прыдатнымі для земляробства толькі пасля меліярацыі. За 1926–1928 гг. з запаснога фонду было надзелена 42 тыс. бядняцкіх гаспадарак і дададзена зямлі 91 700 бядняцкім і малазямельным серадняцкім гаспадаркам [7, с. 75].

Да вясны 1925 г. удалося рэалізаваць сукупнасць мерапрыемстваў нэпа, якія ўключалі арэнду зямлі і наём рабочай сілы, стабілізацыю фінансавай сістэмы і замену натуральнага падатку грашовым і г. д. Патрабуючы высокіх тэмпаў рэалізацыі партыйных рашэнняў, на Пленуме ЦК КП(б)Б 3 мая 1925 г. А. І. Крыніцкі сцвярджаў, што ў гаспадарчай палітыцы і практыцы работы на вёсцы занадта шмат перажыткаў «ваеннага камунізму» і першай задачай «з'яўляецца цяпер рост накаплення ў вёсцы, узбагачэння дробнага гаспадара» [8, арк. 2–3]. Менавіта ў гэты перыяд адзначаецца пэўны дуалізм меркаванняў шэрагу партыйных кіраўнікоў. Некаторыя з іх лічылі, што бальшавікі, як прадстаўнікі дзяржаўнай партыі, павінны падтрымаць моцнага гаспадара, але як камуністы – рабіць стаўку на бедняка. Такая пазіцыя атрымала жорсткі адказ М. М. Галадзеда: «У нас няма дваістай палітыкі, у нас ёсць палітыка, ухваленая ўсёй партыяй» [9, арк. 79].

Між тым М. І. Бухарын, на якога спасылаўся А. І. Крыніцкі, пазней гаварыў пра неабходнасць паслядоўнасці ў палітыцы: «Калі сёння будзе адна, заўтра – другая, паслязаўтра – трэцяя, калі нічога нельга будзе зараней ні прадбачыць, ні разлічыць, то ён [селянін] не зможа гаспадарыць» [10, с. 290]. Крытыка з боку партыйных структур была накіравана ў першую чаргу супраць папярэдніка Д. Ф. Прышчэпава – С. Л. Гельтмана. Аднак Д. Ф. Прышчэпаў, апаніруючы А. І. Крыніцкаму ў пытанні абрэзкі зямлі, таксама звяртаў увагу на небяспеку рэзкай змены курсу, паколькі, як ён сцвярджаў, «бядняк зусім не будзе верыць, кулак усё роўна па-ранейшаму будзе нас лаяць, бо зямлю ў многіх ужо адабралі, мы толькі ўсё ўскладнім» [8, арк. 44]. Меркавалася абрэзаць не болей за 10 % сялянскіх гаспадарак. Беларускія кодэксы, у адрозненне ад расійскага, не прадугледжвалі прымусовага выдзелу па патрабаванні меншасці (1/5 зямельнага таварыства), паколькі асноўнай мэтай яго ініцыятараў было атрыманне большай колькасці зямлі, а не імкненне палепшыць гаспадарку. Заўважана, што пры іншым падыходзе гэта вяло да бясконцых перадзелаў зямлі і не садзейнічала павышэнню яе якасці. Пры вызначэнні максімальных і мінімальных норм працоўнага землекарыстання было вырашана пакінуць

двару такую колькасць зямельнай плошчы, якую ён мог бы апрацаваць сіламі членаў сям'і пры ўмове, што гаспадарка будзе весціся не менш інтэнсіўна, чым дазваляюць натуральныя і эканамічныя ўмовы раёна. Быў сфарміраваны фонд для надзялення зямлёй беззямельных і малазямельных. Асноўнай формай землекарыстання, якая падтрымлівалася дзяржавай, стаў пасёлак [11, арк. 109–111, 212].

Найважнейшай рысай эканамічнай палітыкі ў БССР у 1920-я гг. быў разлік на ўласныя рэсурсы. Урад арыентаваў на максімальна беражлівы падыход да іх выкарыстання. Высокія кошты на драўніну стымулявалі самавольныя вырубкі [12, арк. 1, 4]. Згаджаючыся з тым, што пытанне аб лесе набыло надзвычайную вастрыню, М. М. Карклін, які ўжо рыхтаваўся заняць пасаду старшыні Дзяржплана БССР, выступіў супраць просьбаў сялянства адпускаць лес бясплатна і адзначыў, што гэта «сфарміруе дзірку ў бюджэце». На яго думку, лес, наадварот, павінен быў прыносіць большы даход. «Нам патрэбна кожнае балота, пень, вярхушкі выкарыстоўваць, каб змаглі паставіць справу так, як патрэбна», – заявіў ён на X з'ездзе КП(б)Б і паабяцаў, што гэта праца будзе цесна звязвацца з пытаннем аб торфе [13, арк. 511–513].

У сярэдзіне 1920-х гг. кіраўніцтва БССР (старшыня ЦВК – А. Р. Чарвякоў, старшыня СНК – І. А. Адамовіч) імкнулася вызначыць раўнапраўны статус Беларусі ў СССР. У часопісе «На аграрным фронце» прыведзена кароткая тлумачальная запіска Урада Беларускай ССР да праекта «Агульныя пачаткі землекарыстання і землеўладкавання Саюза ССР». Дакумент сведчыць пра тое, што беларускі ўрад застаўся незадаволены распрацаваным у Маскве праектам, паколькі дакумент, «дэталізуючы ўсе пытанні землекарыстання і землеўпарадкавання, па сутнасці, з'яўляецца Усесаюзным Зямельным кодэксам і пакідае на вырашэнне асобных саюзных рэспублік у галіне рэгулявання зямельных адносін толькі выкананне зямельнага заканадаўства Саюза, між тым як у адпаведнасці з арт. 1 Канстытуцыі СССР у кампетэнцыю Саюза ССР у асобе яго вышэйшых органаў уваходзіць "устанаўленне агульных пачаткаў землеўпарадкавання і землекарыстання"» [14]. Урад Беларусі прапанаваў свой праект, згодна з якім «уся зямля, якая ўваходзіць у склад тэрыторыі Саюза ССР, складае ў межах кожнай саюзнай рэспублікі дзяржаўную ўласнасць гэтай рэспублікі» [14]. Ад імя Урада БССР дакумент падпісалі намеснік старшыні СНК БССР М. Карклін і кіраўнік спраў СНК БССР М. Мароз.

На пэўным этапе развіцця БССР з умацаваннем інстытутаў улады ўзмацняўся новы фактар, які можна акрэсліць як фактар дзяржаўнасці. Патрэбы рэспублікі як асобнага арганізма далёка не заўсёды супадалі з рашэннямі цэнтра і прымушалі рэспубліканскія ўлады кіравацца інтарэсамі БССР і адстойваць яе правы (што станавіліся адначасова і ўласнымі інтарэсамі рэспубліканскай партыйна-гаспадарчай эліты, якая складвалася ў гэты перыяд). Фактар дзяржаўнасці (інтарэсаў БССР і яе інстытутаў) далёка не заўсёды быў звязаны з нацыянальным і этнічным фактарамі, бо любая дзейнасць, накіраваная на абарону паўнамоцтваў рэспублікі, аб'ектыўна садзейнічала ўмацаванню Беларусі як дзяржавы. «Значную ролю ў арганізацыі ўніверсітэта выканаў удала падабраны на гэту высокую пасаду рэктар універсітэта прафесар Уладзімір Пічэта, – адзначаў С. Кандыбовіч. – Ён не быў беларусам, але актыўна і добрасумленна праводзіў патрэбныя мерапрыемствы па ўмацаванні ўніверсітэта» [15, с. 12]. Адстойваючы пазіцыі БССР, А. І. Крыніцкі (першы сакратар ЦК КП(б)Б у 1924–1927 гг.) пісаў у сувязі са стварэннем Заходняй вобласці І. В. Сталіну: «Беларусь – самастойная рэспубліка. Яна мае права мець упаўнаважанага пры Урадзе БССР, а не ў Смаленску» [16, арк. 279–280]. Названыя фактары маглі выступаць у цеснай узаемасувязі, што знайшло, на наш погляд, сваё выяўленне ў дзейнасці многіх прадстаўнікоў Савецкай Беларусі, у прыватнасці ў працы Д. Ф. Прышчэпава і НКЗ БССР, які з'яўляўся ў 1920-я гг., па сутнасці, найважнейшай установай у рэспубліцы.

Для мадэрнізацыі вёскі патрабаваліся сродкі, і атрымаць іх магчыма было толькі з вёскі. Ужо вясной 1926 г. у партыйным кіраўніцтве БССР наспела разуменне мэтазгоднасці больш дынамічнай мадэрнізацыі вёскі. На пасяджэнні Пленума ЦК КП(б)Б 27–29 красавіка 1926 г. адзначалася, што «75 % тавараў прамысловасці спажывае горад, адбываецца натуралізацыя гаспадаркі» [17, арк. 25]. Было агучана пытанне: «Ці зможам мы гэта забяспечыць за кошт прыватных сялянскіх гаспадарак?» – і вырашана «рухацца мінімальнымі тэмпамі, без акцэнту на тое, што гэта можа быць зроблена за кошт сялянства, найперш праз ускосныя падаткі, праз цэны на прамысловыя тавары і г. д.» [17, арк. 36]. Пры гэтым зазначалася, што «індустрыялізацыя ў канчатковым выніку праводзіцца ў інтарэсах сялянства, калі нават сялянства гэтага і не разумее, усё роўна трэба ўзяць грошы ў сялянства, нават супраць яго волі» [17, арк. 37]. Аднак прадстаўнікі НКЗ пярэчылі: «Сельская гаспадарка складае ў бюджэце суму, большую за 300 млн руб. Галоўныя сумы плаціць сялянства, плаціць не ў выглядзе падатку, а праз ускосныя падаткі, праз цэны і г. д. Прапановы аб павелічэнні сельгаспадатку для нас непрымальныя» [17, арк. 40]. З мэтай памяншэння ўскоснага падатку на сялянства было прынята рашэнне аб зніжэнні цэн на шэраг прамысловых тавараў у сярэднім на 3,5 %, у тым ліку на цукар – 17,9 %, цвікі – 5,4 %, скураныя вырабы – да 5,4 % [18, арк. 58].

Імкненне першага сакратара ЦК КП(б)Б А. І. Крыніцкага максімальна хутка выкарыстаць механізмы рыначнай эканомікі, зрабіць акцэнт пераважна на развіцці сельскай гаспадаркі абумоўлівала яго супярэчнасці са старшынёй СНК БССР І. А. Адамовічам, які ў 1927 г. быў накіраваны на працу ў Маскву. Разам з тым адстойванне А. І. Крыніцкім беларускай пазіцыі, актывізацыя нацыянальнай палітыкі ў перыяд яго знаходжання ў БССР таксама не засталіся не заўважанымі ў партыйным цэнтры. У маі 1927 г. А. І. Крыніцкага змяняе В. Г. Кнорын, які ўжо меў вопыт супрацьстаяння нацыянальным памкненням у Беларусі. Заява В. Г. Кнорына пры адкрыцці XI з'езда ЦК КП(б)Б 22 лістапада 1927 г. сведчыла пра тое, што прадчуванне магчымай вайны прысутнічала не толькі ў сялянскіх чутках: «СССР пераможа і ў вайне, якая мае адбыцца, адваюе права на сацыялістычнае будаўніцтва ў нашай краіне» [19, арк. 1]. Акцэнт на мабілізацыі ўсіх сродкаў і сіл у пакалення, якое перажыло Першую сусветную вайну, разумеўся як найважнейшая палітычная задача. Асэнсоўвалася і важнасць падтрымкі ўлады сярэднім класам, які набраў моц. У сваёй справаздачы на з'ездзе В. Г. Кнорын падкрэсліваў: «Важней за ўсё для нас – адносіны серадняка: з кім ідзе серадняк – з намі ці супраць нас; і цэнтральным пытаннем у нашай палітыцы было і застаецца прыцягненне на бок савецкай улады серадняка, неабходнасць весці яго ў саюзе з беднатой. І паставіць на чале гэтага саюзу бедняка» [19, арк. 1]. Варта заўважыць, што такая лінія прадвызначыла раскол вёскі і ўступіла ў супярэчнасць з сялянскім менталітэтам.

Вынікі сельскагаспадарчай вытворчасці 1926/27 гаспадарчага года засведчылі зніжэнне валавой прадукцыі па ўсіх асноўных галінах, за выключэннем жывёлагадоўлі, пры некаторым павелічэнні неземляробчых даходаў насельніцтва. У выніку прырост прадукцыі сельскай гаспадаркі склаў толькі 8 % (у папярэднім годзе – амаль 51 %) [20, арк. 8–10]. За 1926–1927 гг. паступіла сельгаспадатку 8 061 370 руб. замест запланаваных 8 345 738 руб. (96,6 %) [20, арк. 20].

У другой палове 1920-х гг. выразна акрэслівалася імкненне дзяржавы надаць усім плацяжам сацыяльны характар, што таксама адмоўна адбілася на эканоміцы. Сяляне не ўмелі, а часцей за ўсё (не маючы даверу да ўлады) і не імкнуліся гандляваць. Падатковая палітыка садзейнічала драбленню і без таго невялікіх гаспадарак. «Калі гаспадарка дзеліцца – гэта парушае ўсе культурныя пачынанні, якія былі закладзены», – заўважаў Д. Ф. Прышчэпаў. Адзін са шляхоў выхаду з гэтай сітуацыі ён бачыў у пашырэнні практыкі паказальных ці так званых культурных гаспадарак, якія захоўваліся ад абрэзкі, але не маглі дзяліцца [13, арк. 552]. Пры вызначэнні памераў падаткаабкладання нярэдка не ўлічвалася спецыфіка Беларусі, пра што Д. Ф. Прышчэпаў гаварыў на VIII Усебеларускім з'ездзе, адстойваючы самастойнасць рэспублікі ў галіне падаткаабкладання. Такога кшталту сітуацыі, аднак, толькі пашыраліся напрыканцы 1920-х гг. [21, арк. 31–33].

Варта адрозніваць гаспадарчую палітыку і гаспадарчую сістэму, якая складваецца пад яе ўплывам. Гаспадарчая сістэма – гэта спосаб арганізацыі і вядзення гаспадаркі, сукупнасць суб'ектаў і аб'ектаў, відаў, сродкаў і метадаў гаспадарчай дзейнасці, якія складаюць адзіны гаспадарчы арганізм (комплекс) па дасягненні сістэмаўтваральных мэт. Адпаведная пэўнаму палітычнаму курсу гаспадарчая сістэма складваецца пастулова і толькі з часам выцясняе ранейшую. Яе фарміраванне не адпавядала жаданым тэмпам і тэрмінам, якія вызначалі ўлады. Тут выявіліся ўплыў традыцыі, сацыяльныя супярэчнасці, недасканаласць кадравага складу кіраўніцтва і пралікі ў гаспадарчай палітыцы. Рыначныя адносіны, як форма рэгулявання адносін паміж вытворцамі і спажыўцамі прадукцыі, ва ўмовах традыцыйнага недаверу сялян да горада патрабавалі ад улады стварэння новых механізмаў мадэрнізацыі, аднак гэта супярэчыла класавым падыходам, якія акрэсліваліся бальшавіцкай партыяй. У выніку адбывалася трансфармацыя кааперацыі ў калектывізацыю, што ажыццяўлялася ва ўніфікаваных формах без уліку гістарычных і прыродных асаблівасцей развіцця беларускай вёскі. З прычыны хуткаплыннасці працэсаў не паспявалі фарміравацца новыя каштоўнасныя і этычныя нормы.

На мяжы 1920–30-х гг. на фоне рэпрэсій супраць кіраўніцтва БССР і беларускай інтэлігенцыі (найперш лінгвістаў і гісторыкаў) пачаў ажыццяўляцца кардынальна іншы курс, накіраваны на рэалізацыю ўнітарысцкай мадэлі мадэрнізацыі. У гэты ж перыяд выявілася перавага над стратэгічнай мэтай савецкай мадэрнізацыі (стварэнне буйных машынізаваных гаспадарак) задачы тактычнай (забеспячэнне хлебам горада, які павінен быў у сціслыя тэрміны стварыць тэхнічную базу). Калгасная форма разглядалася як пэўны механізм рэквізіцыі збожжа. Адбывалася замена кантрактацыі, што трансфармавалася з 1922 г. ад формы рыначнага пагаднення да прымусовага збору (з 1928/29 гаспадарчага года) абавязковымі дзяржаўнымі нарыхтоўкамі (1932).

У такіх умовах асноўнай прычынай росту колькасці калгаснікаў была спроба сялян схавацца ад раскулачвання, якое адбывалася ў надзвычай жорсткіх формах. Асобнай старонкай барацьбы з сялянствам стала высылка кулакоў. Ва ўмовах рэквізіцый збожжа і голаду ў вёсцы выявілася сітуацыя, калі падсобная гаспадарка заставалася крыніцай забеспячэння хлебам. У выніку недароду бульбы насельніцтва

Беларусі апынулася ва ўмовах яшчэ большага голаду ў параўнанні з тым, які быў зафіксаваны ў 1931–1932 гг. У 1933 г. голад распаўсюдзіўся ў паўднёвай, а пасля і цэнтральнай частцы БССР. Арганізацыйнае ўпарадкаванне калгасаў у 1932–1934 гг. разам з новай хваляй ціску на сялян прадвызначыла завяршэнне калектывізацыі як адміністрацыйна-прымусовай формы мадэрнізацыі.

Гісторыкі маюць справу не з нейкай абстрактнай чалавечай істотай, а з чалавекам, які жыве ў пэўны час, у канкрэтнай мясцовасці, мае свой жыццёвы і генетычна пераняты вопыт продкаў [22, с. 196–223]. Паводле вызначэння М. В. Доўнар-Запольскага, «правы на зямлю асвячаюцца і падтрымліваюцца працай на ёй. Недастаткова мець права на зямлю па нараджэнні, – неабходна, каб гэта права падтрымлівалася працай» [23, с. 46]. Разуменне такога падыходу мы знаходзім у аграрных праграмах беларускіх партый. У 1920-я гг. размеркаванне зямлі найчасцей ажыццяўлялася па фактычным землекарыстанні. Пэўнае адлюстраванне працоўнага прынцыпу карыстання зямлёй можна знайсці ў вызначэнні мінімальнай і максімальнай норм землекарыстання, звязаных з наяўнасцю рабочых рук у сям’і.

Зямля заставалася галоўнай каштоўнасцю на працягу стагоддзяў. Яшчэ ў 1920-я гг. беларускія сяляне, зарабіўшы грошы ў Амерыцы, імкнуліся вярнуцца, каб прыдбаць зямлю на радзіме. Яны не спыняліся, нават калі зямля не станавілася іх уласнасцю. Добрым прыкладам гэтага з’яўляецца арганізацыя камуны «Звязда» ў Навасёлкаўскай воласці Ігуменскага павета. Як жа адбылося так, што ўжо ў 1930-я гг. можна было пачуць: «Раз зямля дзяржаўная, значыць, нічыя»? Шмат хто з даследчыкаў бачыць у такой пазіцыі рэакцыю на несправядлівасць у дачыненні да селяніна, іншыя звязваюць гэта з тым, што зямля перастала быць уласнасцю вяскоўца. На наш погляд, пачуццё гаспадара на зямлі сялянствам звязвалася найперш не з прыватнай уласнасцю, а з імкненнем пазбавіцца ад умяшання іншых асоб і сіл у свае сялянскія справы. Сяляне вельмі асцярожна падыходзілі да змен форм гаспадарання. Але новыя ўмовы вызначалі новыя паводзіны маладога пакалення вяскоўцаў. Праца на вёсцы заставалася недастаткова механізаванай, цяжкай і руціннай. Калі раней яна забяспечвала стабільнасць жыцця і з’ўлялася ў пэўнай ступені творчай, то зараз нават канкрэтныя метады і формы аграрных дзеянняў прадпісваліся зверху асобамі, не заўсёды кампетэнтнымі ў пытаннях сельскай гаспадаркі. Разбуралася традыцыйнае сялянскае ўяўленне пра тое, што галоўная мэта і змест працы – гэта зямля, якая са старажытнасці ўвасабляла свабоду. Шляхта, як выключна сельскагаспадарчае саслоўе, не развітвалася з зямлёй, нягледзячы на тое, што пераважна вяла цяжкія сельскагаспадарчыя работы самастойна. Зямля не толькі не дадавала гонару і свабоды, але і не магла зберагчы нават ад голаду. Калі пасля Першай сусветнай вайны, ратуючыся ад галоднай смерці, жыхары гарадоў кінуліся ў вёску, то падчас калектывізацыі, наадварот, сялянства накіравалася па лепшае жыццё ў горад. На вясковых нарадах пры ЦК КП(б)Б паведамлялася: «Наконт калектывізацыі <…> часта прыходзіцца чуць такія прапановы ад сялян: “Хай нашу зямлю забярэ дзяржава і нас ператворыць у рабочых, бо нам няма ўжо далей як жыць”» [24, арк. 124]. Навука і новая тэхніка не пазбавілі ад рызыкі сельскагаспадарчую працу, селянін па-ранейшаму шмат у чым залежаў ад прыроды. Разам з тым калі раней ён з недаверам ставіўся да адукацыі і лічыў неэфектыўным укладанне сродкаў у веды, то сельскія юнакі і дзяўчаты савецкага часу пры вымушаным выбары варыянта «вёска, а не горад» з большай ахвотай накіроўваліся вучыцца ва ўстанову вышэйшай адукацыі сельскагаспадарчага профілю. Яны заўважалі не толькі лозунгі, але і тое, што ў паўсядзённым жыцці вясковы спецыяліст атрымліваў стабільную зарплату, мог мець дабрабыт большы, чым у радавога вяскоўца. Як сцвярджае М. П. Касцюк, «калектывізацыя сельскай гаспадаркі як надзвычайная з’ява ў савецкай сістэме гаспадарання з’явілася своеасаблівай, складанай і надзвычай цяжкай формай мадэрнізацыі грамадства на яго шляху да фарміравання новых сацыяльна-эканамічных і палітычных адносін» [1]. Заўважана, што гэтыя два этапы мадэрнізацыі – 1920-я і 1930-я гг. – раздзелены не толькі межамі дзесяцігоддзяў, не толькі зменамі ў савецкай і партыйнай палітыцы, але і пачаткамі кардынальных зрухаў у сацыяльнай псіхалогіі і эканамічных паводзінах беларускага сялянства.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС (*REFERENCES*)

1. *Касцюк М. П.* Рэформы і рэвалюцыі як шляхі мадэрнізацыі грамадства ў XX ст. // Працы гістарычнага факультэта БДУ : навук. зб. / рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. Мінск, 2009. Вып. 4. С. 203–208 [Kasciuk M. P. Reforms and revolutions as the ways of modernization of society in the XX century. *Pracy gistarychnaga fakul’tjeta BDU* : navuk. zb. Minsk, 2009. Vol. 4. P. 203–208 (in Belarus.)].

2. Constitution of the People’s Republic of China [Electronic resource] // The National People’s Congress of the People’s Republic of China. URL: http://www.npc.gov.cn/englishnpc/Constitution/node_2825.htm (date of access: 10.05.2016).

3. Собрание узаконений и распоряжений рабоче-крестьянского правительства Социалистической Советской Республики Белоруссии. 1923. № 6. Ст. 55.

4. Собрание узаконений и распоряжений рабоче-крестьянского правительства Белорусской Социалистической Советской Республики. 1925. № 11. Ст. 93.

5. *Алиева Л. В.* Реализация Земельного кодекса РСФСР 1922 г. в контексте эволюции крестьянской поземельной общины (на материалах Псковской губернии) // Псков. 2006. № 24. С. 148–152 [Alieva L. V. Realizatsiya Zemel'nogo kodeksa RSFSR 1922 g. v kontekste evolyutsii krest'yanskoi pozemel'noi obshchiny (na materialakh Pskovskoi gubernii). *Pskov.* 2006. No. 24. P. 148–152 (in Russ.)].
6. Нац. арх. Рэсп. Беларусь. Ф. 334. Воп. 1. Спр. 727.
7. Победа колхозного строя в Белорусской ССР / М. П. Костюк [и др.]. Минск, 1981.
8. Нац. арх. Рэсп. Беларусь. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 1992.
9. Нац. арх. Рэсп. Беларусь. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 2518.
10. *Бухарин Н. И.* Проблемы теории и практики социализма. М., 1989.
11. Нац. арх. Рэсп. Беларусь. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 2295.
12. Нац. арх. Рэсп. Беларусь. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 2283.
13. Нац. арх. Рэсп. Беларусь. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 3083.
14. Краткая объяснительная записка к проекту «Общие начала землепользования и землеустройства Союза Правительства Белорусской ССР» // На аграрном фронте. 1926. № 10. С. 77–80 [Kratkaya ob'yasnitel'naya zapiska k proektu «Obshchie nachala zemlepol'zovaniya i zemleustroistva Soyuza Pravitel'stva Belorusskoi SSR». *Na agrar. fronte.* 1926. No. 10. P. 77–80 (in Russ.)].
15. *Кандыбовіч С.* Разгром нацыянальнага руху ў Беларусі / аўт. прадм. В. Скалабан. Мінск, 2000.
16. Нац. арх. Рэсп. Беларусь. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 1500.
17. Нац. арх. Рэсп. Беларусь. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 2522.
18. Нац. арх. Рэсп. Беларусь. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 3102.
19. Нац. арх. Рэсп. Беларусь. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 3090.
20. Нац. арх. Рэсп. Беларусь. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 2732.
21. Нац. арх. Рэсп. Беларусь. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 4209.
22. *Ходзін С. М.* Беларуская вёска ў міжваенны час: шляхі і формы савецкай мадэрнізацыі (1921–1939). Мінск, 2014.
23. *Довнар-Запольский М. В.* Исследования и статьи. Киев, 1909. Т. 1 : Этнография и социология, обычное право, статистика, белорусская письменность.
24. Нац. арх. Рэсп. Беларусь. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 4211.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 19.08.2016.*
*Received by editorial board 19.08.2016.*